*В. Ч. Гронская,*
*кандыдат філалагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ТЭМА «ЗАГУБЛЕНАГА ЖЫЦЦЯ» Ў ПРОЗЕ ТОМАСА БЕРНХАРДА (на прыкладзе апавядання «Мантэнь»)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Томас Бернхард (*Thomas Bernhard, 1931–1989*), празаік і драматург, займае асаблівае месца ў пасляваеннай аўстрыйскай літаратуры. У яго творах спалучаюцца наватарская манера пісьма і вернасць традыцыйным прыёмам стварэння тэкстаў. Бернхард ніколі не набліжаўся да авангардызму, аднак стаў заснавальнікам новых жанраў і выпрацаваў уласную паэтыку, якая вылучае яго з шэрагу іншых пісьменнікаў другой паловы XX ст.

Томас Бернхард неаднаразова называў сябе «разбуральнікам гісторый». На самой справе адной з адметнасцей апавядальнай манеры пісьменніка з’яўляецца крайняя спрошчанасць сюжэтаў. Змест тэкстаў Бернхарда можна перадаць у некалькіх фразах. Як слушна заўважае Н. С. Паўлава, «усё адбылося ў яго творах яшчэ да пачатку дзеяння. Сюжэтам рухаюць не падзеі – дастаткова рэзка акрэсленай сітуацыі» [4, с. 270].

Героі Бернхарда існуюць, як правіла, у нейкай адасобленай ад свету прасторы. Гэта замкнёная прастора мае ў апавяданнях сімвалічны характар, увасабляе сабой нездзяйсняльную, часта недарэчную тэорыю, асуджаную на крушэнне. Персанажы знаходзяцца нібыта ў зняволенні ў саміх сябе, у сваёй фіктыўнай ідэі.

Адметная і аўтарская манера адлюстравання такога свету. Гэта заблытаны маналог, які пераскоквае з адной тэмы на іншую, але жорстка звязаны лейтматывамі і паўторамі. Па словах А. Белабратава, «перад намі паўстае «голы чалавек на голай зямлі», нейкая экзістэнцыя, нейкі комплекс ацэнак, адчуванняў, рэакцый, фобій, надзей, сумненняў» [1].

Адной з цэнтральных тэм празаічных (і не толькі) твораў Томаса Бернхарда з’яўляецца ў выніку тэма «загубленага жыцця», якую можна ахарактарызаваць як апісанне «маніякальных рытуалаў самаразбурэння» [3, с. 291]. Паспрабуем прасачыць некаторыя адметнасці яе ўвасаблення на прыкладзе апавядання «Мантэнь» (*«Montaigne»*).

Безыменны Я-апавядальнік звяртаецца з маналогам да ўяўнага суразмоўцы. Ён расказвае, як трапіў у гэты дальні куток вежы, дзе

цяпер знаходзіцца, прыхапіўшы па дарозе з хатняй бібліятэкі кнігу Мантэня. Скардзіцца на сваякоў, якія, на яго думку, спрабуюць так ці інакш яго знішчыць. Кароткі выклад сюжэту апавядання, як бачым, укладаецца ў два сказы.

Усю прастору твора займае засяроджаная на сабе, бесперапынная прамова галоўнага героя. Гэта магло б падштурхнуць да суаднясення з біяграфічнай прозай або з традыцыйнай формай апавядання ад першай асобы. Але ўнутраная сутнасць прозы Бернхарда іншая.

Герой не распавядае пра сваё жыццё, не дае фактаў, не расказвае гісторый. Ён гаворыць аб тым, што яго перапаўняе, дэкларуе свае перакананні і сваю нешчаслівасць. Пры гэтым фармальна маналог героя нагадвае звернутую да кагосьці вусную гаворку: такое ўражанне ствараюць бясконцыя паўторы адных і тых жа слоў, разрывы думкі, пераскокванне з аднаго на другое. Падаецца больш правільным праводзіць паралель менавіта з фрагментам дыялога, а не з варыянтам «плыні свядомасці», таму што, як і іншыя персанажы Бернхарда, герой «Мантэня» гаворыць для слухачоў. На гэта ўказваюць і крытычная скіраванасць маналога, і пастаянныя спробы патлумачыць логіку сваіх учынкаў, што праходзяць праз увесь твор.

Прывядзём у якасці прыкладу адзін з фрагментаў тэксту:

*«У любым з маіх выказванняў няма нічога іншага, як гэты здзек і гэтая пагарда, ад якой яны аднаго дня загінуць, але я думаю, што сам я аднаго дня загіну ад іх здзеку і пагарды. На шляху з бібліятэкі да вежы я думаў, што не ўцёк ад іх за сорак два гады, хаця сорак два гады майго жыцця не трымаў у галаве нічога іншага, як уцячы ад іх; пазбавіцца ад іх ніколі не сталася для мяне магчымым, нават на кароткі час, бо калі я ад іх пазбаўляўся, гэта было толькі надуманым пазбаўленнем, не кажучы ўжо пра ўцёкі, думаць пра якія ў мяне больш няма смеласці. Іх клопат быў бы заўсёды найклапатлівейшым, іх увага найвышэйшай, але ў той жа час іх безнадзейнасць, што датычыцца мяне, заўсёды была б найжахлівейшай»* [2, с. 259].

Такім чынам, галоўным героем гэтага апавядання (і тыповым героем Томаса Бернхарда) з'яўляецца мыслячы чалавек, жыццё якога амаль цалкам напоўненае напружанай духоўнай дзейнасцю. Ён адукаваны, дасведчаны ў літаратуры і філасофіі, ён лічыць працу думкі адзінай магчымай формай чалавечага існавання, але менавіта такі варыянт жыцця ў творах Бернхарда незваротна вядзе да самаразбурэння асобы.

*«Калі ў мяне раней быў смяротны страх узяць кавалак цукру з*

*цукарніцы ў сталовай, так цяпер я смяротна баюся ўзяць у бібліятэцы кнігу, і ў мяне ёсць найвялікшы смяротны страх, што кніга будзе філасофскай, як учора ўвечары. Я заўсёды любіў Мантэня, як нікога іншага. Я заўсёды ўцякаў да майго Мантэня, калі быў у смяротным страху. Я дазваляў Мантэню быць маім кіраўніком і кіроўцам, вадзіць і зводзіць мяне. Мантэнь заўсёды быў маім збаўцам і збавіцелем. У той час як я нарэшце перастаў давяраць усім астатнім, маёй бясконцай вялікай філасофскай сям'і, якую я магу назваць толькі бясконца вялікай французскай філасофскай сям'ёй, дзе заўсёды была парачка нямецкіх ды італьянскіх пляменнікаў і пляменніц, якія, як я мушу сказаць, вельмі рана памерлі, мне заўсёды было добра ў майго Мантэня»* [2, с 261].

У выніку на старонках твораў Томаса Бернхарда перад намі паўстаюць «вечныя аўтсайдэры, «чужасныя арганізмы» без радзімы і каранёў» [3, с. 294]. Гэтыя героі – суб'екты, якія думаюць і пакутуюць. Менавіта ўнутраны свет нешчаслівага персанажа робіцца цэнтрам аповеду ў Бернхарда, у той час як усё іншае прадстаўлена фрагментарна і з'яўляецца толькі фонам.

Маналог героя пры гэтым пастаянна кружляе вакол некалькіх устойлівых паняццяў. У дадзеным апавяданні ў такой ролі выступаюць смерць, жыццё, страх, знішчэнне, абвінавачванне, хлусня, уцёкі. Пратаганіст цвердзіць пра нянавісць да сваякоў і бачыць у паўсядзённых і банальных падзеях пагрозу сваёй свабодзе і свайму жыццю. Такія ідэі, якімі апанаваныя героі, таксама з'яўляюцца адным з функцыянальных прынцыпаў створанага Бернхардам свету.

У шэрагу найважнейшых матываў у разглядаемым апавяданні ёсць матыў уцёкаў ці, больш шырока, хады і руху ўвогуле. Герой некалькі разоў, паўтараючыся, расказвае, як ён дайшоў да дальняга кутка вежы, апісвае свой шлях сюды, цемру, павуціну і іншыя паказальныя дэталі гэтага шляху, які відавочна сімвалізуе для апавядальніка ўцёкі ад сям'і. Пра гэтыя ўцёкі пратаганіст кажа і непасрэдна, без алегорый, падкрэсліваючы іх абсалютную немагчымасць. Вобраз шляху з'яўляецца і ў разважаннях пра ўзаемаадносіны са сваякамі, пра магчымасць паразумення з імі:

*«Так яны праклалі для мяне шмат шляхоў, а я не пайшоў ніводным з іх, паўтараюць яны і сёння. Усе шляхі, якія яны паказалі і праклалі, былі б для мяне найлепшымі, яны ўжо бачылі, як я іду па ўсіх гэтых шляхох, але ўсе гэтыя шляхі я ім, а праз гэта таксама і сабе, знішчыў з самага пачатку. Я аднойчы сказаў ім, што не хачу ніколі ісці шляхам, але іх непаразуменне і іх нахабнейшая змова з гэтым непаразуменнем, грунтоўная подласць, адразу ж далі мне*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*зразумець бессэнсоўнасць майго выказвання, і я ніколі больш не паўтараў гэтую заўвагу, што я ніколі не хачу ісці шляхам. <…> Так на працягу дзесяцігоддзяў я гаварыў усё менш і нарэшце нічога больш не гаварыў, а іх здзекі заўсёды рабіліся бязлітаснейшымі»* [2, с. 259–260].

Як бачна не толькі з гэтага тэксту, хада і пакутлівыя разважанні суправаджаюць існаванне многіх персанажаў, створаных пісьменнікам. Яны ўсё жыццё ходзяць па адным маршруце, але іх мэта – сысці назаўсёды. Часцей за ўсё нерэалізаваная, таму што або героі Бернхарда пастаянна вяртаюцца да аб’ектаў сваёй нянавісці і не могуць жыць без звыклага пачуцця агіды, або (напрыклад, «Мантэнь») іх перакананні аказваюцца памылковымі: свет неадчэпных ідэй пратаганіста супрацьпастаўляецца ў фінале зусім іншай, чым у яго ўяўленні, рэчаіснасці.

*«Я чытаў з майго Мантэня пры зачыненых аканіцах найбезразважнейшым чынам, бо без штучнага святла гэта вымагала столькі высілкаў, ажно да фразы: трэба спадзявацца, з ім нічога не здарылася! Фраза была не з Мантэня, але ад маіх сваякоў, якія шукалі мяне, ходзячы пад вежай узад і ўперад»* [2, с. 264].

Тэма «загубленага жыцця» гучыць у самых розных і па форме, і па стылі творах Томаса Бернхарда. У маналогах герояў мы можам убачыць іх перадузятасць і схільнасць да самаразбурэння. Але пры гэтым у большасці выпадкаў у фінале твора аўтар выходзіць на ўзровень прыпавесці і спрабуе знайсці адказ на пастаўленыя пытанні або хаця б прымусіць чытача задумацца над магчымымі інтэрпрэтацыямі апісанай у тэксце сітуацыі.

---


1. *Белобратов, А. В.* Томас Бернхард : двадцать лет спустя / А. В. Белобратов // Иностранная литература. – 2010. – № 2. – URL : http :// magazines. russ.ru/inostran/2010/2/be2.html.

2. *Бернхард, Т.* Мантэнь / Т.Бернхард // ARCHE (Пачатак). – 2011. – № 9 (108): Аўстрыя : ад імперыі да нацыі. – С. 258–264.

3. *Никифоров, В. Н.* Томас Бернхард / В. Н. Никифоров, Н. С. Павлова // История австрийской литературы XX века : в 2 т. – М. : ИМЛИ РАН, 2010. – Т. 2 : 1945–2000. – С. 284–309.

4. *Павлова, Н. С.* Природа реальности в австрийской литературе / Н. С. Павлова. – М. : Яз. славян. культуры, 2005. – 311 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ